УДК 821.161.3

***З.П. Мельнікава***

# ДУХОЎНА-СВЕТАПОГЛЯДНАЕ ВЫЗНАЧЭННЕ АСОБЫ І ПАЭЗІЯ ЗЬНІЧА (АЛЕГА БЕМБЕЛЯ)

У артыкуле акрэслены актуальныя праблемы духоўна-светапогляднага вызначэння сучасніка і падкрэсліваецца вялікая роля нацыянальнай літаратуры як фактара выхавання духоўнай культуры асобы. Заўважаецца, што, насуперак дамінаванню багаборчых, атэістычных ідэй у савецкі час, беларуская літаратура ўтрымлівала значны духоўны, маральна-філасофскі патэнцыял. Аўтар даводзіць, што ў канцы XX – пач. XXI стст. у беларускай літаратуры склалася духоўна-хрысціянская плынь, выдатным прадстаўніком якой стаў паэт Зьніч (Алег Бембель). Яго творы, народжаныя хрысціянска-этычным мысленнем, сталі з'явай у сучаснай беларускай літаратурнай прасторы.

Чалавецтвам, у тым ліку грамадазнаўчымі навукамі, як і кожным чалавекам паасобку, выведзена безліч фармулёвак аб сэнсе і прызначэнні жыцця. Але на кожным гістарычным этапе, у кожным грамадстве вылучаюцца свае, асаблівыя аксіялагічныя прыярытэты і дамінанты, якія маюць пераважна прагматычную, канкрэтна-гістарычную абумоўленасць.

Сучаснае цывілізаванае грамадства, узброенае навукова-тэхнічным прагрэсам, наасфернымі і кагнітыўнымі адкрыццямі, часта далёка адыходзіць ад пазнання Бога, ухіляецца вызнаваць вечныя філасофска-маральныя катэгорыі – Сумленне, Духоўнасць, Любоў, Ісціну. Толькі мастацтва, найперш літаратура, зрэдку нагадваюць кожнаму чалавеку пра Бога і Неба, дапамагаюць у зямным жыцці супрацьстаяць маральнаму і духоўнаму разбурэнню.

«На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог. Яно было напачатку ў Бога. Усё праз Яго пачало быць… У ім было жыццё, і жыццё было святлом людзей…» (Ін 1,5). Нават калі і часта чытаем, прамаўляем гэтыя радкі, мы рэдка задумваемся над іх першасным сэнсам. Між тым, закладзены ў іх глыбінна-філасофскі ключ «Слова – Бог – быццё – жыццё – святло» дапамагае раскадзіраваць вышэйшы і сапраўдны сэнс існавання кожнага народа і асобнага чалавека. Большасць нашых сучаснікаў прыходзяць да перакanання, што менавіта Бога-Слова (слова і воля Бога) павінна вызначаць быццё ўсіх і кожнага, што толькі пры такой умове чалавек можа набыць духоўнае святло, спасцігнуць сутнасць уласнага прызначэння і наканаванасці ў храме чалавецтва – у грамадстве.

Думаецца, што найдалей ад евангельскіх ісцін пра Бога-Слова і яго духоўнае святло адышло савецкае грамадства ў XX ст. Багаборчыя матывы прысутнічалі ў літаратуры, пачынаючы з міфа аб Праметэі, але ў савецкія часы яны сталі палітычна абавязковымі і ідэалагічна запатрабаванымі. У савецкі час узнікла і функцыянавала літаратура-«бязбожніца», у якой віталіся атэістычны сарказм і антыхрысціянскі астракізм. Выразным увасабленнем савецкага атэістычнага багаборніцтва ў беларускай літаратуры сталі словы: «Мы не паклонімся богу – бога стварыў чалавек!» (Кандрат Крапіва). У савецкія дзесяцігоддзі са свядомасці беларусаў зніклі духоўныя падзвіжнікі, святыя беларускай зямлі: Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Аўраамій Смаленскі, Елісей Лаўрышаўскі, Сафія Слуцкая, Афанасій Брэсцкі, Гаўрыіл Беластоцкі… Разбуралася шматвекавая традыцыя духоўна-хрысціянскага падзвіжніцтва, нішчылася беларуская «этнадухоўная прастора» (І. Чарота). Камуністычная ідэалогія строга пільнавала, каб народ і надалей быў адлучаны ад царквы, ад высокадухоўных хрысціянскіх ідэй. Так, летам 1970 г. Руская Праваслаўная Царква рыхтавалася адзначыць 800-годдзе Еўфрасінні Полацкай. У сувязі з гэтым у ЦК Кампартыі Беларусі паступіў сакрэтны ліст з Масквы.

У ім выказана «партыйная заклапочанасць», што аўтарытэт Святой Еўфрасінні пераўзыйдзе аўтарытэт камуністычнага кіраўніцтва: «Церковники попытаются использовать эту дату для более широкого привлечения в храмы верующих, прославления прогрессивной роли русской православной церкви. …Эту дату целесообразно отметить лишь архиерейским богослужением в Спасо-Евфросиниевской церкви в гор. Полоцке, в других церквах специальных богослужений, на наш взгляд, проводить не следует.

Как нам представляется, средствам массовой информации, за исключением специальных изданий, нет необходимости привлекать к деятельности Евфросиньи Полоцкой внимание трудящихся республики» [3, с. 151].

У савецкія дзесяцігоддзі «народнае хрысціянства беларусаў» (І. Чарота) заставалася ў фальклорных творах, традыцыйных абрадах і тэкстах. Парасткі хрысціянскай веры жылі ў спадчыннай памяці беларусаў, пра што сведчаць творы беларускіх пісьменнікаў XX ст.: Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча, Казіміра Сваяка, У. Жылкі, Н. Арсенневай, Л. Геніюш, М. Сяднёва, С. Грахоўскага, В. Шведа, А. Лойкі, Р. Барадуліна, Н. Загорскай, Н. Мацяш, В. Жуковіча, іншых. Але сур'ёзных творчых зваротаў да хрысціянскай, увогуле веравызнаўчай тэматыкі ў той літаратуры не было. Богаадступніцтва ў беларускай літаратуры савецкага часу стала, па трапных словах літаратуразнаўцы І. Чароты, адной з прычын таго, што сёння «канчаткова размыты адрозненні высокага і нізкага, дабра і зла, хараства і пачварнасці, вечнага і мінучага» [2, с. 4].

На жаль, у бліжэйшы час у Беларусі не чакаецца ўзлёту культуры, мастацтва, філасофіі. Сёння ў беларускім грамадстве па-ранейшаму не запатрабаваны мысляры-гуманітарыі, духоўныя лідэры, «уладары беларускай думкі» (Якуб Колас). Несумненна, што менавіта літаратура як важная галіна мастацка-духоўнай «вытворчасці» павінна паказваць шляхі выйсця з духоўнага і маральнага крызісу чалавека і грамадства.

Менавіта на сцвярджэнне высокіх маральных ідэалаў арыентуе і заклікае чытачоў сучасная беларуская духоўна-хрысціянская паэзія, якая як прыкментая жанравастылявая плынь склалася ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзяў.

Пра тое, як цяжка было заставацца незалежнай, нацыянальна зарыентаванай духоўнай асобай у атмасферы ваяўнічага атэізму і татальнай ідэалагічнай рэгламентаванасці савецкага грамадства, якое пастанавіла да 80-х гадоў XX ст. пабудаваць камунізм, сведчыць лёс інака Мікалая – паэта Зьніча. Ён вырас у сям'і камуніста, Народнага мастака БССР Андрэя Бембеля ў Мінску. Бацька, перакананы камуніст, верыў, што «рэлігія – опій для народа», як сцвярджала партыйная ідэалогія. Скульптар Бембель вельмі любіў сына і даваў яму поўную свабоду ў чытанні кніг, у выбары жыццёвых дарог. Па ўласным прызнанні паэта, у сямнаццаць год праз творы Ф. Дастаеўскага (і асабліва «Братоў Карамазавых», ён «адчуў Хрыста». Але да сапраўднай, глыбокай веры было далёка. Ва ўзросце трыццаці год ён уступіў у Камуністычную партыю з перакананнем, што можна рэфармаваць савецкі рэжым знутры. Аднак хутка зразумеў, што хрысціянства з ідэалогіяй і справамі КПСС не сумяшчальныя. У 1972 г. на кватэры святара Алег Бембель тайна прыняў хрышчэнне.

Фарміраванне грамадзянскіх і светапоглядных арыенціраў будучага паэта-інака прыпала на эпоху «шасцідзесятніцтва», калі працэсы дэмакратызацыі савецкага грамадства пасля асуджэння таталітарных злачынстваў і культу асобы Сталіна ўплывалі на разняволенне ідэалагічнага і духоўнага жыцця людзей, асабліва моладзі. Кумірамі, а пасля добрымі старэйшымі сябрамі Алега Бембеля сталі Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч. Алег Бембель закончыў кансерваторыю, мог бы зрабіць паспяховую кар'еру музыканта, але ён сур'ёзна захапіўся адраджэнцкай ідэалогіяй, прафесійнымі філасофскімі даследаваннямі, звязанымі з праблематыкай беларускага духоўнага і культурнагістарычнага адраджэння. У 1970-я гг. суткамі чытаў «самвыдат», шмат пісаў, забываючыся на сон, адпачынак, ежу. У 80-я гады канчаткова для сябе зразумеў, што адзіная

каштоўнасць для яго – духоўнае жыццё. Многія лічылі факт веры Алега Бембеля праявай не зусім здаровай псіхікі.

Аўтарытэт бацькі ратаваў ад турмы.

У Інстытуце філасофіі і права тагачаснай Акадэміі навук Беларусі ён падрыхтаваў да абароны кандыдацкую дысертацыю «Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў духоўнай культуры». Вядома, што «ахоўнікі» яшчэ ўсемагутнай у 1980-я гг. партыйнай ідэалогі не дазволілі абараняць дысертацыйнае даследаванне «нацыяналістычнай» праблематыкі. У 1985 г. гэтая праца Алега Бембеля выйшла ў Англіі асобнай кнігай з назвай «Родная мова і маральна-этычны прагрэс».

Прафесійны музыкант і філосаф Алег Бембель побач з Васілём Быкавым, Зянонам Пазняком быў у шарэнгах актывістаў Беларускага Народнага фронту, стаў непахісным бунтаром і пратэстантам супраць дзяржаўна-чыноўніцкай хлусні. Ён падтрымліваў хрысціянска-кансерватыўнае крыло БНФ, спадзеючыся, што можна злучыць ідэі дзяржаўнасці і хрысціянства. І як вынік – звальненне з працы ў Акадэміі навук. Непахіснага прапаведніка роднай мовы як асноўнай умовы прагрэса і незалежнасці Беларусі, ідэолага беларускага адраджэння канца XX ст., паэта, дысідэнта, філосафа-антыкамуніста са згоды бацькі-камуніста ўлады змясцілі ў псіхбальніцу, дзе гвалтам «лячылі» ад вальнадумства…

У Жыровіцы ён прыехаў у 1996 г., зняможаны цяжкай хваробай і паражыўшы глыбокія расчараванні ў былых сябрах-дэмакратах, у няспраўджаных надзеях на па-сапраўднаму вольную Беларусь. Прасіў дазволу дажыць тут апошнія дні.

На шчасце, лёс і воля нябёс, глыбокая Вера Ўсявышняму стварылі цуд: адступіла невылечная хвароба, Алег Бембель, які да гэтага ўжо быў вядомы чытачу як паэт Зьніч, стаў іераманахам Мікалаем.

Сёння інак Мікалай – насельнік Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра (Слонімскі раён Гродзенскай вобласці).

…я кінуць грэшны сьвет
сябе прымусіў –
каб не згубіцца ў думках і вяках…
…Жыровічы…
…тут – сэрца Беларусі…
І да яго – у кожнага –
свой шлях… [1, с. 200].

У час, які вызначаўся нестабільнасцю грамадска-ідэалагічных арыенціраў, занепакоена і адначасова аптымістычна загучала слова паэта-інака і духоўнага асветніка Зьніча. Ён перакананы і пераконвае нас, што толькі Вера, Хрысціянства сёння прынцыпова супрацьстаяць антыдухоўным і антымаральным працэсам, якія разбураюць асобу і грамадства.

Чатыры кнігі паэзіі Зьніча: «Саната ростані» (Беласток, 1988 г.), «За мурам: саната вяртаньня ў чатырох частках» (Слонім, 2007 г.) і «– Мне не цябе шкада, а тваю маці…»: саната літасьці ў чатырох частках (альбо: гісторыка-філасофская элегія ў рыфмарах…) (Слонім, 2009 г.), «Крэсіва» (Беласток, 2012 г.) – дазваляюць гаварыць аб *хрысціянска-этычным мысленні* як устойлівай рысе творчасці гэтага аўтара і прыкметнай плыні беларускай паэзіі, як, дарэчы, і ўсёй сённяшняй беларускай літаратуры. Менавіта хрысціянскім светаўспрыманнем і этыкай вылучаюцца многія вершы нашых сучаснікаў: Р. Барадуліна, Н. Загорскай, Я. Чыквіна, Г. Твarановіч, Л. Рублеўскай, В. Шніпа, В. Шведа, А. Кудласевіча і некаторых іншых.

Названыя кнігі паэзіі Зьніча, а таксама «Евангелле ад мамы», «Ксты» Р. Барадуліна, а таксама многія творы згаданых вышэй паэтаў, сведчаць *аб беларускай духоўнай*

*паэзіі* як цэласнай эстэтычнай з’яве, з уласцівымі ёй аб’ектыўнымі заканамернасцямі, якія прасочваюцца з народных каляндарна-абрадавых песень, вершаваных псальмаў-перакладаў «Псалтыра» Ф. Скарыны да твораў хрысціянска-філасофскай тэматыкі сённяшніх беларускіх пісьменнікаў.

У 20-я гг. мінулага стагоддзя хрысціянска-этычнае мысленне выцяснялася з палітызаванага савецкага грамадства. Парэшткі яго ў наступныя дзесяцігоддзі захоўваліся ў мастацтвазнаўстве, эстэтыцы, літаратуразнаўстве, псіхалогіі… Паэт-інак Зьніч сваімі радкамі настойліва і шчодра вяртае беларускі народ у Храм Веры і духу, запрашае кожнага задумацца аб уласнай сутнасці і аб велічы Тварца.

Паэзія Зьніча унікальная як эстэтычна-філасофская сістэма. Яна ўтрымлівае хрысціянска-этычны, маральны і гістарычна-філасофскі досвед аўтара, а прадмет яго занепакоенага грамадзянскага роздуму – лёс, будучыня Беларусі і яе народа. Вось адзін з мноства прыкладаў – радкі з верша «Рэха, альбо Спроба ачышчэння»:

…мы, Беларусы –
ў марных хаўрусах –
цяжка шукаем да Бога дарог…
ў моры нядолі, ў поўні няволі
нас не пазбавіў літасьці
Бог…
…нас аб’яднала вера Хрыстова…
шчыра бароняць малітвы Сьвятых…
духу нячыстаму
Божае Слова
супрацьпаставім
у справах зямных!.. [1, с. 70].

Паэт абраў цяжкі, самаахвярны шлях слугавання народу і Бацькаўшчыне – маліцца перад Усявышнім за Беларусь, за кожную чалавечую душу

…у Хрысьце
Мы – жывая Цэласьць…
мы – часьцінкі Боскага Я…
дай нам, Хрысьце,
мудрасьць і сьмеласьць
адчуваць: мы – Твая Сям’я…
…хіба мы – не браты і сёстры… –
Тваёй музыкі – песьняры?..
…колькі ж, людцы, у вальсе-mefisto
Будзем з д’яблам над процьмай кружыць?.. [1, с. 207].

Паводле Зьніча, найцяжкі грэх – грэх манкуртства, беспамяцтва, якое вядзе да забойства роднай маці, да руйнавання народных святынь. Паэт прапануе кожнаму з нас адкрыць у сабе чалавека прыгожага, верніка і патрыёта адначасова, якому Бог даў разам з душой і хрысціянска-грамадзянскую місійнасць. Каб не змарнаваць вялікі Боскі дарунак – жыццё, чалавек павінен нястомна працаваць – рукамі, розумам, сэрцам – несупынна дасканаліцца, і памятаць, што жыццё дадзена для стваральных, прыгожых, добрых спраў. У гэтым пераконвае сваім словам паэт. Відаць таму многія яго вершы маюць дыялагічную структуру: паэт размаўляе з «зямнымі царамі» і зашоранымі «фактапаклоннікамі», з «сынамі зямлі пад белымі крыламі», з «Братамі-палітыкамі», з «павадырамі», «прарокамі», «вязьнямі сумленьня», з «сястрычкамі» – матулямі, дзяўчаткамі, дзецюкамі…

Кожны з нас у роздуме паэта-верніка – брат ці сястра. Здзіўляе бяздонная глыбіня і бязмежная прастора паэзіі Зьніча. Аднак галоўныя, важнейшыя перажыванні паэта лакалізаваны на Бацькаўшчыне. Мудрае і роздумна-медытатыўнае асэнсаванне чалавека, сэнсу яго прысутнасці на Зямлі гарманічна спалучана з грамадзянскімі матывамі – маленнем паэта за Беларусь і за кожнага з нас: каб мелі ўцаркаўлёныя, відушчыя і літасцівыя душы.

…пад завірухай кроў ліецца…
вятрыска – памяць расхістаў…
о, Беларусь, -- ці станеш сэрцам
Укрыжаванага Хрыста?..

…ці зможаш –
Пад няўпынным зьдзекам,
сказаць: – мой лёс –
не сьлепата!..
як прад табой паўстане пекла
сышоўшага ў труну – Хрыста?..

…а як пад сонцам – небакраем –
заружавее цемната –
ці ты заўсёды адчуваеш
Сілу Ўваскрослага
Хрыста? [1, с. 5].

Матывы Уваскрасеньня Хрыстова, развагі паэта пра волю і няволю, пра «найвышэйшы дар Свабоды», пра тое, што кожнаму сэрцу і кожнаму народу «Гасподзь свабоду волі даў», якія ўсхвалявана гучаць у вершах паэта, несумненна, актуалізуюць і ўзбагачаюць хрысціянскую па паходжанні, грамадзянска-патрыятычную па-сутнасці ідэю Адраджэння. У беларускай літаратуры яна была запачаткавана ў «нашаніўскі» час Максімам Багдановічам, Казімірам Сваяком, Алесем Гаруном, Янкам Купалам, Якубам Коласам, Змітраком Бядулем…

Кнігі Зьніча – гэта сучасная духоўна-грамадзянская паэзія, паэзія роздуму і закліку да беларускага народа пераадолець «няўпынны зьдзек» і «сьляпы лёс», паверыць у сапраўднае Ўваскрашэнне.

Паэтычнае, узрушана-малітоўнае слова Зьніча стварае і ўгрунтоўвае духоўны радавод Беларусі, у якім следам за Еўфрасінняй Полацкай, Францішкам Скарынай і іх ахвярнымі наступнікамі паўстаюць і вялікія сучаснікі, асветнікі і грамадзяне XX і пачатку XXI стагоддзяў – Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Мулявін, Васіль Быкаў… Так, напрыклад, не проста глыбока кранае і хвалюе, але і натхняе на такое ж высокае слугаванне Беларусі верш-прысвячэнне Уладзіміру Мулявіну, які «Русь Белую у сэрца ўзяў»:

…і подыхам Нябёсных сіл –
Няўрымслівы і утрапёны –
Нібыта ўвёў усе плямёны
У Вобраз Белае Русі… [1, с. 182].

Узрушаным, гарманічным акордам вечнай і адданай любові роднаму краю гучыць верш-прысвячэнне Уладзіміру Караткевічу, які сваёй рытмаструктурай нагадвае выдатны Караткевічаў верш «Беларуская песня»:

…Ты ўзышоў там, дзе Белая Вежа
Сусьветавым дрэвам

І зямлю, і сузор'і
Карэньнем і гольлем арэ…
дзе пад Белымі крыламі
вечнае праўды напевы
чуе ўпарты народ, што
і ў Сконе нябёс
не памрэ… [1, с. 183].

Такі ж кранаючы, стрымана-мужны, якім быў сам Васіль Быкаў, і верш-прысвячэнне Зьніча яму – «Васіль». Вось некалькі радкоў з гэтага па-грамадзянску высокага верша:

…калі канфармісцкае бздуры
патоп нашу годнасць паклікаў –
паўстаў ля сэрца культуры
сумленны пісьменнік – Быкаў…[1, с. 185].

Хвалюючыся за праблемы духоўнага самавызначэння сучаснікаў, паэт давярае чытачу і свой уласны духоўны радавод:

…хто сэрцайку майму сугучны –
З тых, што ступалі па Зямлі
І ў Вечнасьць к Богу адышлі?..
…Шапэн…
Бетховен…
Фёдар Цютчаў…
…усіх і не пералічыць…
Напэўна, першы – Дастаеўскі
(апроч святых)…
… і замак Крэўскі
пра іншых велічна маўчыць…
…спытаеце пра «філасофію Зьніча»?
ён – лекар «іншаслоўна-іншавернай схізмы»…
ён – цэламудрасьць
адраджаць пачаў –
у Праваслаўным
Бела-Рус-цэнтрызме… [1, с. 187].

Гэтыя радкі дапамагаюць чытачу спасцігнуць сэнс духоўна-асветнага подзвігу беларускага паэта-інака. Зьніч, як апостал Павел, што ў біблейскія часы стварыў для бязверных людзей больш за іншых апосталаў пасланняў (аж чатырнаццаць), якія заўсёды цаніліся царквой як крыніца сапраўднага хрысціянства, у сваёй паэзіі прадстаўляе асновы духоўна-маральнага вучэння для сучасніка, асабліва для маладога чалавека. У вершах Зьніча надзіва і нязвыкла гарманічна паяднаны Слова, Мова, Беларусь, грамадзянскасць, духоўнасць і нават палітыка. Яго паэзія – надзвычай змястоўная і неабходная кожнаму чалавеку для гаворкі сам-насам. Яна дае магчымасць сумоўя з высокадухоўнай, інтэлектуальна і этычна дасканалай асобай. Спасціжэнне радкоў паэта – гэта сумаленне за Бацькаўшчыну, Будучыню і за кожнага чалавека.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Зьніч «– Мне не цябе шкада, а тваю маці…»: саната літасьці ў чатырох частках (альбо: гісторыка-філасофская элегія ў рыфмарах…) / Зьніч. – Слонім : Слонімская друкарня, 2009. – 272 с.

2. Насустрач Духу : анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі / Уклад. і прадм. І.А. Чароты. – Мінск : Ураджай, 2001. – 238 с.

3. Рублевская, Л.И. Время и бремя архивов и имён : очерки, эссе, пьеса / Л.И. Рублевская, В.В. Скалабан. – Минск : Літаратура і мастацтва, 2009. – 192 с.

***Melnikava Z.P.*** **Spiritual and World Outlook Importance of a Personality in the poetry of Znich (Oleg Bembel)**

In the article actual problems of spiritual and lyrical definition of the contemporary are outlined and the big role of literature as factor of education of spiritual culture of the personality is emphasized.

The author notes that at the end of 20 beginning of 21 centuries in Belarusian literature the spiritual and Christian trend was formed in which the poet Znich (Oleg Bembel) was the outstanding representative. His works which were encouraged by Christian and ethical thinking, became the phenomenon in modern Belarusian literary space.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 10.09.2013